**Іх імёнамі** названы вуліцы : [воіны-афганцы г. Віцебска] // Віцебскі рабочы. — 1990. — 12 чэрв. — С.4.

## ІХ ІМЁНАМІ НАЗВАНЫ ВУЛІЦЫ

Пяць былых «жданаўскіх» вуліц абласнога цэнтра сталі насіць імёны воінаў-віцябчан, якія загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Рэспубліцы Афганістан. Хто яны, якія мелі воінскія званні і ўзнагароды? Аб гэтым пытаюцца нашы чытачы.

Капітан Леанід Мікалаевіч Бяліцкі ўзнагароджан ордэнамі Леніна і Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу». Маёр Станіслаў Міхайлавіч Гурынаў і прапаршчык Анатоль Аляксандравіч Маўрын – кавалеры ордэнаў Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі. Яфрэйтар Аляксандр Рыгоравіч Даніленкаў удастоены ордэна Чырвонай Зоркі і медаля «За адвагу». Дарэчы, да прызыву ў армію ён працаваў на заводзе заточных станкоў. Старшы лейтэнант Алег Рыгоравіч Тувальскі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Ен займаўся ў Віцебскім аэраклубе ДТСААФ, а затым скончыў ваеннае вучылішча.

Пяць адважных воінаў, пяць нашых землякоў сталі... вуліцамі. Яны працягваюць жыіць і працаваць разам з намі. Жывуць у нашай памяці, нашых справах. І мы ўсе пакланяемся і будзем заўсёды пакланяцца іх неўміручаму подзвігу.